**Васільеў, А.** Лепш зоры мірныя / А. Васільеў // Ленінскі сцяг (Лепель). — 1988. — 6 снеж. — С. 3.

**ЛЕПШ ЗОРЫ МІРНЫЯ**

Яшчэ сёння, здараецца, ён прачынаецца з цяжкасцю ў грудзях, а ў паветры, здаецца па-ранеўшаму выразна гучыць вокліч: «Шураві!» Так мірныя афганцы і контррэвалюцыянеры-мяцежнікі называюць салдат, якія дапамагаюць рэспубліканскай арміі абараніць просты люд ад падкопаў мясцовай і знешняй рэакцыі. Нялёгкая ім выпала служба. Аб гэтым выдатна ведае Міхаіл Шкіранда, які непасрэдна прымаў удзел у многіх баявых аперацыях. Адна з іх застанецца ў памяці назаўсёды.

…На другім годзе яго службы падраздзяленне атрымала заданне знішчыць атрад бандытаў, якія забівалі мірных жыхароў і руйнавалі паселішчы. Мінула некалькі дзён у беспаспяховых пошуках праціўніка. Навокал было ціха і спакойна, быццам на гэтай зямлі бандытаў не існавала наогул. Але цішыня раптам прынесла нечаканую бяду.

Як высветлілася пасля, нечае хітрае вока пастаянна вяло назіранне за перамяшчэннем савецкіх салдат і тут жа паведамляла аб гэтым душманам. Аднойчы, калі да світання заставалася якой паўгадзіны, на прывал, дзе спыніліся начаваць воіны, абрушыліся ракеты. Нападзенне, аднак, хутка закончылася, але страт нанесла намала.

Каб падобнага не адбылося зноў, было вырашана ў час начоўкі месца стаянкі мяняць некалькі разоў, а разведчыкам дасканальна правяраць мясцовасць уздоўж дарогі як мага далей у тым напрамку, куды рухаўся атрад. Таакя тактыка апраўдала сябе: раніцай ракеты падалі на тое месца, дзе спыняліся яшчэ ўвечары, у першы раз.

Неўзабаве з´явіліся і разведчыкі. Яны прынеслі цікавае для ўсіх паведамленне. Аказваецца, перад самым досвіткам, яны нечакана ўбачылі, як па дарозе амаль бязгучна рухаецца грузавік з патушанымі фарамі. Вось ён спыніўся, у кузаве замітусіліся цені, а праз колькі хвілін вогненныя смерчы прарэзалі цемру.

Душманам-налётчыкам уцячы не ўдалося. А неўзабаве была знішчана і асноўная банда.

У розных сітуацыях давялося пабываць хлопцу, часта рызыкуючы жыццём. І ўсюды камсамолец з гонарам выконваў свой абавязак. Дапамагалі, вядома, воінская выручка і кемлівасць. І яшчэ – верныя сябры, акія знаходзіліся побач. З многімі ён перапісваецца і сёння. Адрасы самыя розныя: Украіна, Казахстан, Расія і Прыбалтыка. Суровыя баявыя выпрабаванні зраднілі беларускага хлопца з яго равеснікамі з іншых братніх рэспублік.

Пасля звальнення ў запас Міхаіл працаваў шафёрам на малочнакансервавым камбінаце – дастаўляў на перапрацоўку з мясцовых гаспадарак малако. Яго аўтамабіль ніколі не стаяў на прыколе. Калі выпадалі рэйсы ў суседнія раёны, выязджаў заўсёды з задавальненнем. Любіў доўгія дарогі, калі ёсць магчымасць няспешна думаць, успамінаць…

Аднак неўзабаве паклікалі Міхаіла Шкіранду іншыя справы. Былыя сябры прапанавалі разам вучыцца ў мараходнай школе. І ён згадзіўся, бо ведаў, што жыццё марака, як і воіна, патрабуе дысцыпліны, сабранасці, волі. А галоўнае – хацелася пабачыць больш свету, паглядзець як людзі жывуць, пажадаць ім мірнага неба.

**А. Васільеў**